**УДК 94(476)**

# РАЗГЛЯД САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД[1].

***Ю. І. ЗГІРСКІ***
**(*Прадстаўлена: канд. гіст.х навук, дац. А .В. СУМКО*)**

*У артыкуле на падставе архіўных дакументаў, матэрыялаў вуснай гісторыі і перыядычнага друку разглядаюцца адмысловыя праявы сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў пасляваенны перыяд. Адзначаная даследчая праблема разглядаецца ў кантэксце Докшыцкага раёна, ў межах якога ў першыя гады пасля вызвалення існавалі розныя сацыяльна-эканамічныя ўклады.*

З 1944 г. тэрыторыя даследавання ўваходзіла ў склад Полацкай вобласці БССР. У пасляваенны перыяд адбываўся працэс інтэграцыі рэгіёна ў сацыяльна-эканамічную мадэль тагачаснай БССР, як быў перапынены Вялікай Айчыннай вайной. З рухам фронту ў 1944 г. на захад, пачалося аднаўленне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і органаў улады, створаных пасля 1939 г.

Рэалізацыя дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі на тэрыторыі Докшыцкага раёна знайшла адлюстраванне ў перыядычным друку тагачаснай Полацкай вобласці, на старонках якога размяшчаецца інфармацыя пра інтэграцыю былога заходнебеларускага рэгіёна ў эканоміку і інфармацыйную прастору тагачаснай БССР [1]. Напрыклад, газета “Бальшавіцкі сцяг” № 59 (69) за май 1945 г. фіксуе, што у межах раёна праводзіцца вясенняя сяўба. Аднак на погляд аўтара інфармацыя пра правядзенне сяўбы ў кантэксце калхознай вытворчасці ў тагачасных СМІ на тэрыторыі Докшыцкага раёна выклікае сумневы, паколькі ўсталяванне калгаснай сістэмы на тэрыторыі раёна адбылося толькі ў 1949 г. Асобныя вясковыя гаспадаркі мелі норму здачы сельскагаспадарчай прадукцыі, што разгледжана ніжэй.

Значным інфармацыйным патэнцыялам валодаюць дакументы справаводства Докшыцкага раёна і асобных сельсаветаў апошняга. Напрыклад, згодна з матэрыяламі справаводства Параф’янаўскага і Докшыцкага сельсаветаў, на момант 1949 г. рэгіён актыўна інтэгруецца ў калгасную сістэму.

Зыходзячы з архіўных дакументаў і матэрыялаў вуснай гісторыі, інфармацыю пра асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў межах Докшыцкага раёна ў пасляваенны перыд можна прадставіць наступнымі блокамі:

1) *Лесазагатоўкі*. Згодна з матэрыяламі справаводства Докшыцкага раёна, галоўны акцэнт рабіўся на лесазагатоўках, аб чым сведчыць як прыцягненне непрацаўладкаваных мужчын на нарыхтоўку леса, з усталяваннем нормы для кожнага безпрацоўнага мужчыны, так і вярбоўка мясцовага насельнітцва на працы як у межах Докшыцкага раёна, так і за яго межамі [2]. На падставе матэрыялаў вуснай гісторыі, вылучаюцца наступныя кірункі вярбоўкі: Урал (РСФСР), Карэлія (Карэла-Фінская ССР, з 1956 г. - РСФСР).

2) *Пастаўкі дзяржаве* часткі сельскагаспадарчых прадуктаў. Апошнія вывозіліся зборшчыкамі ў загатоўчы пункт ў Параф’янаве) [2].

3) *Калектывізацыя*. З 1949 г. адбылася ліквідацыя аднаасобных гаспадарак і пераразмеркаванне зямлі падчас стварэння калгасаў, аб чым сведчаць запісы ў Гаспадарчых кнігах (далей ГК) за 1949 і 1950 гг. [3, л. 44]

Адзначаныя мерапрыемствы ў межах сацыяльна-эканамічнай палітыкі непазбежна ўплывалі на матэрыяльнае становішча вясковага насельніцтва тагачаснага Докшыцкага раёна, сведчаннем чаго з’яўляецца зямельнае пытанне пасля вайны, разгледжаннае ніжэй.

На падставе запісаў у Гаспадарчых кнігах за 1949 – 1950 гг. можна рабіць выснову аб пераразмеркаванні зямлі ў межах стварэння калгасаў. Падставай для такой высновы з’яўляюцца рэзкія змены ў пунктах ГК аб зямлі і колькасці хатняй жывёлы, а менавіта скарачэнне колькасці хатняй жывёлы і, у першую чаргу, скарачэнне плошчаў прыватнай зямлі асобных сялянскіх сем’яў [3, л. 26]. Апошняе ўплывала ня толькі на матэрыяльнае становішча асобных жыхароў вёсак, але і на стаўленне да правадзімай палітыкі ў рэгіёне. Разам з тым, неабходна адзначыць, што з боку беззямельнымі і малазямельнымі жыхароў вёсак Докшыцкага раёна фіксуецца пазітыўнае ўспрыняцце калгасаў, аб чым сведчаць матэрыялы вуснай гісторыі з тэрыторыі сучаснага Крыпульскага сельскага савета: *“А мама ж пасля палякаў рада была, што калхоз. Раней і коні нада і плуг, а цяпер і абаруць…”* [4].

Супрацьлеглая сітуацыя была для ўладальнікаў зямлі, якія часцей адмоўна адносіліся да палітыкі калектывізацыю, бо з іх пункта гледжання гэта прыводзіла да разбурэння ўласнай гаспадаркі

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД “Стратэгіі выжывання і адаптыўныя практыкі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд”, дамова № Г23ИП-037.

і пагаршэння уласнага ўзроўня жыцця: *"Тады тут калхозы сталі, былі ж людзі багатыя і коней было, мы парку дзяржалі, а ў каго зямлі было болей, у каго па дзве валокі, у тых усё пазабіралі, а тады, самі ўсё самі сеялі, а ў восень, калі трэба было ўсё сабраць, сагналі ўсіх у калхоз. Гналі. І што рабіць, ніхто ня хочыць, усе плачым, я ж ўжо настаяшчая дзяўчынё была, помню, як гэта рабілася. Ну і што, сабраліся, што ай, не пайдзём мы, каб у ручную ўсе разам жалі у адно, а не як у адзін шнур жалі. А тады гэдак мы жалі, плачым усе. А тады прыехалі і каля начальства рабілі сабранне, у аднэй хаце зрабілі, хто пайшоў, хто не пайшоў, тады сказалі: „Калі хто заўтра пойдзе сам сабе жаць – цюрма". Ну, тады адна баба рашылася, яна кажыць, Тадорка: „Бабы, дурныя, не пайдзём, мала што яны кажуць, пойдзем жаць як і раней". Яе тады яе адразу схапілі, адвязлі, пасудзілі і сядзела гэта баба."* [5].

Такім чынам, вылучаюцца два супрацьлеглых стаўлення да ўсталявання новай, для рэгіёну, эканамічнай сістэмы: пазітыўнае (фіксуецца ў беднай часткі насельніцтва), негатыўнае (фіксуецца ў насельніцтва з сярэднімі гаспадаркамі і заможных земляўладальнікаў).

Разам з тым, калі казаць пра першыя гады пасля вызвалення ад нацыстаў, то ўспаміны фіксуюць штодзённыя цяжкасці, звязаныя з сістэмай жыццезабеспячэння. Асабліва пранізліва гучыць тэма, звязаная з падаткамі. Напрыклад, матэрыялы палявой экспедыцыі аўтара на тэрыторыі Докшыцкага раёна фіксуюць наступнае:

*"Дык мы з мамай, есці хочацца, дык мы з мамай… Зярно ж усё змялі гэтыя, расійскія. … Пайдзём.. там гэдкае во жыта, пасцілку возьмем і… красці ж нельга было. Кошык бульбы і ўсё. І тады мы пашлі, яно было спелае, абабілі і панеслі. Маці сабрала не сабе, а дзяцей гадаваць, дзяцей карміць. Во як мы жылі, во табе калхоз. А тады, яшчэ, ужо выраслі… тады прыйдуць, гэты прэдседацель, прывядзець іх, свякроў была такая баявейшая, а яны ўжо, а шкаф, шкаф які там, з дошак збіты, падушкі, падушкі апішуць. Там жа ж налог нейкі нада было плаціць."* [4].

Ва ўмовах пасляваеннай калектывізацыі на тэрыторыі тагачаснага Докшыцкага раёна, крыніцай дадатковага прыбытку з'яўлялася рэалізацыя ўласнай прадукцыі. Базары існавалі пры гарадах і мястэчках. У межах тагачаснага Докшыцкага раёна базары праводзіліся ў Докшыцах і Параф'янаве.

Грошы ішлі ці на набыццё неабходных тавараў (напрыклад, для школы) ці ўкладваліся ў вытворчасць тых тавараў, якія прынясуць больш прыбытак. Пра апошняе яскрава сведчыць наступны ўспамін пра тое, што ўласную сельскагаспадарчую прадукцыю прадавалі, каб купіць неабходныя інгрыдыенты для вытворчасці самагона: *"А на шчот базара… быў базар. За дражджамі хадзілі на базар, самагонку ж не зробіш без дражджэй, я сама насіла цыбулю прадаваць. Бабушка два маткі цыбулі паложыць у мех у абыкнавенны, што бульбу, прасты, што бульбу выбіралі, ну, два маткі цыбулі, дзевяць кілометраў пяшком."* [5]. Самагон у пасляваннай вёсцы выступаў у якасці "вадкай валюты". Практычна за ўсе паслугі гаспадарчага плану (узворванне прысядзібнага участка, дапамога ў будаўніцтве, дастаўка дроваў, арэнда цяглай сілы – каня і да т.п.) ва ўмовах дэфіцыту грашовых сродкаў сяляне разлічваліся саматужна выробленым алкагольным напоем [6, с.134].

Мястэчкі тагачаснага Докшыцкага раёна, як і ва ўсіх заходніх раёнаў БССР, вылучаліся адрозным, ад вёсак, эканамічным становішчам, што звязана як з разбурэннем даваенных эканамічных сувязяў, так і рознымі відамі дзейнасці жыхароў гарадоў і вёсак. Неабходнасць у забеспячэнні насельніцтва Докшыц прадуктамі харчавання стала прычынай для вылучэння часткі вуліц пад прыватныя агароды, што дэманструе праблемы ў забеспячэнні мястэчак і гарадоў прадуктамі харчавання [2]. У асноўным, жыхары Докшыц атрымлівалі зямельныя ўчасткі за кошт зямлі, выехаўшых у Польшчу ў другой палове 1940-х гг., што зафіксавана ў справаводстве гарадскога савета Докшыц [7, с. 1].

Рэалізацыя сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў пасляваенны перыяд адмыслова адбівалася на матэрыяльным становішчы жыхароў Докшыцкага раёна. Сташлenne да мерапрыемстваў залежала ад сацыяльнага статуса і ўзроўня дабрабыту насельніцтва. Рэзкае скарачэнне зямельных надзелаў асобных вясковых гаспадарак фіксуецца ў перыяд з 1949 па 1950 гг., што звязана са стварэннем калгасаў у пасляваенны перыяд і пераразмеркаваннем. Абвастралася сітуацыя з прадуктамі харчавання, асабліва з мясам. Спецыфіка сітуацыі адбілася на нормах здачы прадуктаў. Напрыклад, жыхарам Докшыцкага сельсавета, было дазволена здаваць малако замест мяса (заўв. 5 л. малака было эквівалентна 1 кг. мяса.) [2]. Усё гэта спрыяла адпаведнаму стаўленню да працэсу калектывізацыі з боку сялян-земляўладальнікаў. У складаных сацыяльна-эканамічных умовах, дадатковай крыніцай даходу з'яўляліся базары ў гарадах і мястэчак. Іншай сітуацыя была ў гарадах і мястэчках.

ЛІТАРАТУРА

1. Зводка аб ходзе веснавой сяўбы па раёнах вобласці: [аб ходзе сяўбы на тэрыторыі Полацкай вобласці]// Бальшавіцкі сцяг. – Полацк, 1945 г. – № 59 (69) . – С. 2.
2. Занальны дзяржаўны архіў г. Глыбокае (ЗГАГлыб.) – Ф. 410. Воп. 1. Спр. 1.
3. ЗГАГлыб. – Ф. 420. Воп. 2. Спр. 2

4. Запісана Згірскім Ю.І. ад жанчыны 1927 г.н. у в. Паўночнае Гняздзілава Докшыцкага раёна.
5. Запісана Згірскім Ю.І. ад жанчыны 1942 г.н. у в. Курдзекі Докшыцкага раёна.
6. Сумко, А. В. Эканамічны і соцыякультурны аспект самагонаварэння ў сельскім ландшафце Паўночнай Беларусі ў другой палове 1940-х – 1960-х гг. / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2018. – № 9. – С.127 – 135.
7. ЗГАГлыб. – Ф. 410. Воп. 1. Спр. 10.